(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт
імя Максіма Танка

УДК 808.26-3(043.3)+808.26-54(043.3)

**ГУБКІНА Алена Васільеўна**

# НАЗВЫ АСОБ ПАВОДЛЕ ДЗЕЙНАСЦІ Ў БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ 20-х ГАДОЎ XX СТАГОДДЗЯ
## (на матэрыяле лексікаграфічных крыніц)

10.02.01 – беларуская мова

Аўтарэферат дысертацыі
на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук

Мінск – 2001

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

Праца выканана на кафедры гісторыі беларускай мовы
Беларускага дзяржаўнага універсітэта

Навуковы кіраўнік – кандыдат філалагічных навук,
дацэнт Кулеш Г.І.

Афіцыйныя апаненты: доктар філалагічных навук,
прафесар Лемцюгова В.П.

кандыдат філалагічных навук,
дацэнт Гуліцкі М.Ф.

Апаніруючая арганізацыя – Брэсцкі дзяржаўны універсітэт
імя А.С.Пушкіна

Абарона ___ _травеня_ 2001 г. у _10_ г.
на пасяджэнні савета па абароне дысертацый К 02.21.01 у Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка па адрасу: 220050, г. Мінск, вул. Савецкая, 18, аўд. 482; тэл. 268-79-27.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка.

Аўтарэферат разасланы "_11_" _красавіка_ 2001 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый П.А.Міхайлаў

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

***Актуальнасць тэмы дысертацыі.*** Лексіка 1920-х гадоў увогуле і назвы асоб паводле дзейнасці ў прыватнасці недастаткова даследаваны ў беларускім мовазнаўстве, нягледзячы на тое, што многія даследчыкі звярталіся да матэрыялаў тых часоў. І.К.Германовіч у кандыдацкай дысертацыі "Нармалізацыя лексікі беларускай літаратурнай мовы ў 20-30 гады XX ст." аналізуе накірункі, шляхі і крыніцы фарміравання і нармалізацыі беларускай лексікі. Беларуская тэрміналогія, шляхі і прынцыпы яе фарміравання, у тым ліку і ў 20-я гады, – аб'ект даследаванняў В.П.Краснея. Асобным праблемам тагачаснага развіцця і функцыянавання лексікі прысвечаны артыкулы І.К.Германовіча, С.М.Запрудскага, Г.І.Кулеш, Л.М.Шакуна. У апошнія гады праблемы культуры беларускай мовы 20-х гадоў у параўнанні з мовай нашага часу закранаюцца ў артыкулах П.У.Сцяцко. Што ж датычыцца вывучэння непасрэдна агентыўных назваў, то тут даследаваны перш за ўсё словаўтваральны аспект, як, напрыклад, у кандыдацкай дысертацыі В.Б.Хацкевіч "Суфіксальнае словаўтварэнне назоўнікаў (суфіксы асобы) у сучаснай беларускай мове", у даследаванні М.А.Паўленкі "Нарысы па беларускаму словаўтварэнню: Жаночыя асабовыя намінацыі ў старабеларускай мове", яго ж доктарскай дысертацыі "Развіццё беларускага субстантыўнага словаўтварэння: Фемінатывы XIV–XX стст.". Спецыфіку жаночых агентываў даследаваў і У.Ц.Піскун у кандыдацкай дысертацыі "Жаночыя асабовыя намінацыі ў сучаснай беларускай літаратурнай мове (на прыкладзе спартыўнай тэрміналогіі)". Пытанні словаўтварэння назоўнікаў, у тым ліку і асабовых, грунтоўна распрацаваны ў кандыдацкай дысертацыі П.В.Вярхова "Суфіксальнае словаўтварэнне назоўнікаў у беларускай мове XV–XX стст.". Лексіка-семантычнаму і словаўтваральнаму аналізу назваў асоб у старабеларускай і ў сучаснай мове прысвечана кандыдацкая дысертацыя М.Р.Гарбачыка "Назвы асоб па рамяству і прафесіі ў беларускай мове". На матэрыяле слоўнікаў 1920-х гадоў утварэнне асабовых назоўнікаў даследуе В.Л.Варановіч. Як бачым, маштабнага даследавання назваў асоб паводле дзейнасці, зафіксаваных у слоўніках 20-х гадоў, у беларускім мовазнаўстве няма. У нашай рабоце мы прасочваем па слоўніках змены, што адбываліся з назвамі асоб паводле дзейнасці на працягу амаль стагоддзя ў семантычным, функцыянальна-стылістычным і словаўтваральным аспектах.

Цікавасць да тэмы выклікана і неабходнасцю вывучэння лексікалагічнага і лексікаграфічнага вопыту, паколькі, па-першае, "на парадак дня, як і ў 1920-я гг., пастаўлена пытанне пра стварэнне поўнага слоўніка сучаснай беларускай мовы агульнага, "далеўскага" тыпу, які павінен аб'яднаць у сваім складзе ўсю (як літаратурную, так і

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

нелітаратурную) лексіку"[1], а па-другое, адбор лексікі і яе падача сучаснымі слоўнікамі задавальняе не ўсіх носьбітаў беларускай мовы, пра што сведчыць, напрыклад, дыскусія на старонках часопіса "Полымя" пасля выхаду пяцітомнага Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы (ТСБМ), выступленні ў друку П.У.Сцяцко, А.А.Каўруса, В.Л.Вараповіча і іншых.

Нельга не пагадзіцца з меркаваннем беларускіх навукоўцаў аб тым, што яшчэ "ў поўнай меры не апісаны і навукова не асэнсаваны лексічныя запасы сучаснай беларускай літаратурнай мовы"[2].

Актуальнасць тэмы абумоўлена таксама тым, што працэсы, якія адбываліся ў 20-я гг. XX ст. у мове, нягледзячы на іх гвалтоўнае спыненне ў 30-я гады, не маглі не паўплываць на сучасны стан беларускай мовы. Не маючы магчымасці ахапіць увесь матэрыял слоўнікаў 20-х гадоў, мы абмежаваліся толькі аналізам назваў асоб паводле дзейнасці. У гэтай групе слоў, на наш погляд, найбольш дынамічна праяўляюцца змены, выкліканыя не толькі моўнымі, але і пазамоўнымі фактарамі. Акрамя таго, назвы асоб паводле дзейнасці шматлікія ў мове і маюць складаныя сувязі са словамі іншых тэматычных груп.

***Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі***. Дысертацыйнае даследаванне з'яўляецца часткай тэмы "Беларуская літаратурная мова і яе нормы: сінхронны і дыяхронны аспекты", якая ўваходзіць у план навукова-даследчай працы БДУ.

***Мэта і задачы даследавання***. Мэтай нашага даследавання з'яўляецца лексіка-семантычная, функцыянальна-стылістычная і словаўтваральная характарыстыка назваў асоб паводле дзейнасці, выяўленых у слоўніках 20-х гадоў.

Для дасягнення пастаўленай мэты неабходна было вырашыць шэраг канкрэтных задач:

- выявіць назвы асоб паводле дзейнасці ў слоўніках 1920-х гадоў;
- параўноўваючы сабраны матэрыял з дадзенымі пазнейшых лексікаграфічных крыніц, ахарактарызаваць віды і прычыны зафіксаваных сучаснымі слоўнікамі лексіка-семантычных змен у назвах асоб паводле дзейнасці;
- выявіць напрамкі і прычыны пераходу назваў асоб паводле дзейнасці ў перыферыйныя пласты лексікі;
- устанавіць асноўныя спосабы словаўтварэння і найбольш прадуктыўныя афіксы пры ўтварэнні назваў асоб паводле дзейнасці ў 20-я гг., а таксама прасачыць на прыкладзе сабранага фактычнага

---

[1] Шчэрбін В.К. Тэарэтычныя праблемы беларускай лексікаграфіі. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 1996. – С. 89.

[2] Шакун Л.М. Гісторыя беларускага мовазнаўства: Вучэб. дапам. – Мінск: Універсітэцкае, 1995. – С. 208.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

матэрыялу змены і іх прычыны ў словаўтваральнай сістэме беларускай мовы на працягу XX ст.

***Аб'ект і прадмет даследавання.*** Аб'ектам нашага даследавання з'яўляюцца назвы асоб паводле дзейнасці, выяўленыя ў перакладных слоўніках 20-х гадоў:

М. і Г. Гарэцкія. Маскоўска-беларускі слоўнік. Вільня,1921.

В. Ластоўскі. Падручны расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік. Коўна, 1924.

М.Байкоў, С. Некрашэвіч. Беларуска-расійскі слоўнік. Мінск, 1925.

С.Серада. Дзелавод. Мінск, 1925.

М.Касяровіч. Беларуска-расійскі слоўнік. Мінск, 1925.

Л.Вашкевіч. Расійска-беларускі слоўнічак дзеля чыгуначных мясцкомаў. Магілёў, 1926.

М.Байкоў, М.Гарэцкі. Практычны расійска-беларускі слоўнік. Мінск, 1926.

М.Байкоў, С.Некрашэвіч. Расійска-беларускі слоўнік. Мінск, 1928.

Прадмет даследавання – больш за 1000 назваў асоб паводле дзейнасці, зафіксаваных у гэтых слоўніках.

***Метадалогія і метады праведзенага даследавання.*** Мэта даследавання і спецыфіка матэрыялу абумовілі выбар у якасці асноўных апісальнага і параўнальна-гістарычнага метадаў. Выкарыстаны элементы статыстычнага аналізу, які дазволіў зрабіць вывады адносна лёсу зафіксаваных у слоўніках 20-х гадоў назваў асоб паводле дзейнасці на працягу XX ст., а таксама прыёмы этымалагічнага, стылістычнага і словаўтваральнага аналізу.

***Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў*** у тым, што гэта першае маштабнае вывучэнне і апісанне канкрэтнай тэматычнай групы на матэрыяле слоўнікаў 20-х гадоў. Навуковая значнасць вынікаў у тым, што яны паказваюць некаторыя асаблівасці фарміравання лексікі беларускай мовы, развіцця слоўнікавай справы на працягу XX ст.

***Практычная значнасць атрыманых вынікаў.*** Дысертацыйная праца змяшчае ў сабе вынікі, якія характарызуюць асаблівасці фарміравання лексічнай і словаўтваральнай сістэм беларускай мовы ў 20-я гады, таму канкрэтны лексічны матэрыял і вынікі яго даследавання могуць быць выкарыстаны ў навуковых працах пры асвятленні пытанняў лексікалогіі, словаўтварэння, пры распрацоўцы спецкурсаў і спецсемінараў.

***Асноўныя палажэнні дысертацыі, што выносяцца на абарону.***

1. Матэрыял перакладных слоўнікаў 20-х гадоў – вынік творчай, у пэўнай ступені эксперыментальнай працы па ўпарадкаванню лексічнай сістэмы беларускай мовы, якая праводзілася з арыентацыяй на

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

выкарыстанне моўнай спадчыны, лексікі народных гаворак, што актывізавала патэнцыяльныя магчымасці беларускай мовы.

2. Змены ў лексічным значэнні назваў асоб, засведчаных слоўнікамі XX ст., адбываліся шляхам а) звужэння значэння полісемантаў за кошт страты кампанента 'асоба'; б) пашырэння семантычнага аб'ёму пры набыцці дадатковага неасабовага значэння; в) замены асабовага значэння на неасабовае/іншае асабовае. Такія семантычныя пераўтварэнні ў большасці выпадкаў фіксаваліся пад уплывам экстралінгвістычных фактараў.

3. Дыферэнцыяцыя назваў асоб паводле канатацыйных элементаў, якая нярэдка была штучнай на працягу XX ст., абумоўлена як зменамі ў рэальнай рэчаіснасці, так і тэндэнцыямі развіцця лексічнай сістэмы беларускай мовы і лексікаграфічнай практыкі.

4. Абсалютная большасць назваў асоб паводле дзейнасці мужчынскага полу, зафіксаваных у слоўніках 20-х гадоў, утварылася марфалагічным спосабам пры дапамозе разнастайных суфіксальных элементаў, прадуктыўнасць якіх змянілася ў наш час. Некаторыя простыя агентывы ў цяперашніх слоўніках заменены складанымі.

5. Назвы асоб жаночага полу паводле дзейнасці, зафіксаваныя ў слоўніках 20-х гадоў, утвараліся ў асноўным суфіксальным спосабам ад адпаведных мужчынскіх. Змена прадуктыўнасці асобных суфіксаў на працягу XX ст. часам была абумоўлена арыентацыяй на прынцыпы рускага словаўтварэння.

***Асабісты ўклад суіскальніка.*** Дысертацыя з'яўляецца самастойным даследаваннем, у межах якога быў сабраны лексічны матэрыял і на падставе яго аналізу выкладзены асноўныя палажэнні.

***Апрабацыя вынікаў дысертацыі***. Дысертацыя абмяркоўвалася на пасяджэннях кафедры гісторыі беларускай мовы Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Асноўныя палажэнні дысертацыі прайшлі апрабацыю на наступных канферэнцыях: 54-я навуковая канферэнцыя студэнтаў і аспірантаў БДУ (красавік–май, Мінск, 1997); навуковая канферэнцыя да 80-х угодкаў праф. Ф.Янкоўскага "Жыццём слугуючы Айчыне" (лістапад, Брэст, 1998); навуковая канферэнцыя маладых навукоўцаў "Сучасная філалогія: сёння і заўтра" (красавік, Мінск, 1999).

***Апублікаванасць вынікаў***. Палажэнні дысертацыі апублікаваны ў трох артыкулах і матэрыялах трох навуковых канферэнцый. Агульная колькасць апублікаванага матэрыялу складае 26 старонак.

***Структура і аб'ём дысертацыі***. Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, трох глаў, заключэння, спіса выкарыстаных крыніц (135 адзінак), спіса ўмоўных скарачэнняў (3 стар.), індэкса прааналізаваных слоў (10 стар.). Агульны аб'ём дысертацыі складае 120 старонак, з іх 101 старонку займае асноўны тэкст.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

***Ва ўводзінах*** абгрунтоўваецца выбар тэмы, апісваецца моўная сітуацыя на Беларусі ў 20-я гады XX стагоддзя, адзначаецца роля тагачасных слоўнікаў у нармалізацыі лексічнай сістэмы.

***У першай главе "Семантычная характарыстыка назваў асоб паводле дзейнасці"*** падаюцца звесткі аб распрацаванасці ў мовазнаўстве пытанняў аб прычынах і відах семантычных змен: прыводзяцца меркаванні А.Мее, Д.М.Шмялёва, Г.Шпербера, У.У.Лявіцкага, Б.А.Плотнікава і некаторых іншых. Падагульніўшы дасягненні айчыннай і замежнай лінгвістыкі па праблеме відаў семантычных змен і ўлічыўшы спецыфіку сабранага і апрацаванага матэрыялу, прапануецца ўласная класіфікацыя назваў асоб паводле дзейнасці ў залежнасці ад відаў семантычных змен, што адбыліся з імі на працягу амаль стагоддзя, якая не супярэчыць вядомым у мовазнаўстве, аднак у пэўнай ступені адрозніваецца ад іх. Апісваюцца словы, якія ў нарматыўных слоўніках нашага часу фіксуюцца са зменамі ў структуры значэння або/і яго аб'ёме. Глава складаецца з трох раздзелаў.

***У першым раздзеле*** падаюцца словы, якія зафіксаваны ў слоўніках са звужэннем лексічнага значэння.

Як паказаў аналіз, семантычны аб'ём слоў са структурай ‘асоба–не-асоба‘ звужаўся за кошт страты кампанента ‘асоба‘ Напрыклад, слова **алейніца** ў слоўніках 20-х гадоў мела значэнні ‘гандлярка алеем‘, ‘бутэлька для алею‘, ‘прыстасаванне для збівання масла‘, а ў слоўніках нашага часу фіксуецца толькі ў значэнні ‘бутэлька, бляшанка, каністра для алею‘. Слова **даведнік** страціла значэнне ‘наведвальнік‘, захаваўшы ‘кніга для навучання‘. Назоўнік **літавальнік** меў значэнні ‘рабочы, які займаецца паяннем‘ і ‘ручны інструмент для паяння‘, зараз асабовае значэнне страцілася (яно замацавалася за словам **паяльшчык**). Назоўнік **стаенны** страціў значэнне ‘работнік, які даглядае коней‘, захаваўшы ‘конь, які знаходзіцца ў стайні‘.

Семантычны аб'ём слоў са структурай ‘асоба--асоба‘ звужаўся за кошт страты аднаго з кампанентаў. Напрыклад, назоўнік **заступнік** меў значэнні ‘намеснік‘ і ‘абаронца‘, зараз у значэнні ‘намеснік‘ гэта слова не фіксуецца. Аналагічныя семантычныя змены адбыліся са словам **заступніца**. З двух значэнняў слова **падказчык** ‘той, хто робіць даносы‘ і ‘той, хто падказвае‘ захавалася толькі апошняе. Слова **пазычальнік** у слоўніках 20-х гадоў зафіксавана ў значэннях ‘той, хто дае пазыку‘ і ‘той, хто бярэ пазыку‘, апошняе значэнне зараз страчана. Слова **пралля** мела значэнні ‘жанчына, якая мые бялізну‘ і ‘жанчына, якая прадзе‘, толькі ў апошнім з іх назоўнік **пралля** фіксуецца ў слоўніках нашага часу. З двух значэнняў слова **пясняр** ‘той, хто спявае, умее добра спяваць‘ і ‘аўтар вершаў‘ захавалася апошняе.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

інш. вартыя функцыянавання ў беларускай літаратурнай мове ў якасці агульнаўжывальных [2;6].

Асноўныя палажэнні дысертацыі адлюстраваны ў наступных публікацыях:

**Артыкулы**:

1. Губкіна А.В. Семантыка і ўжывальнасць назваў асоб паводле дзейнасці (на матэрыяле Беларуска-расійскага слоўніка М.Байкова і С.Некрашэвіча. Мн., 1925) // Весн. Бел. дзярж. ун-та. Сер. 4. Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. – 1999. – №1. – С. 32–35.
2. Губкіна А.В. Перамяшчэнне назваў асоб паводле дзейнасці ў перыферыйныя пласты беларускай лексікі // Весн. Бел. дзярж. ун-та. Сер. 4. Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. – 2000. – № 2. – С. 38–43.
3. Губкіна А.В. Словаўтваральная характарыстыка назваў асоб паводле дзейнасці // Роднае слова. – 2000. – № 11. – С. 36–39.

**Матэрыялы канферэнцый**:

4. Губкіна А.В. Найменні асоб у Беларуска-расійскім слоўніку М.Байкова і С. Некрашэвіча // Сб. науч. работ студентов и аспирантов Бел. гос. ун-та. В 2-х ч. – Минск: Изд-во БГУ, 1998. – Ч. 1. – С. 196–198.
5. Губкіна А.В. Словы, якія выйшлі з тэматычнай групы 'назвы асобы паводле дзейнасці' (на матэрыяле слоўнікаў 20-х гадоў XX ст.) // Современная филология: сегодня и завтра. / Под ред. Гапоненко И.О., Леонович В.А., Сурковой Е.С. – Минск: Изд-во БГУ, 1999. – С. 45–48.
6. Губкіна А.В. Асаблівасці словаўтварэння назваў асоб жаночага полу паводле дзейнасці (на матэрыяле лексікаграфічных крыніц 20-х гадоў) // Жыццём служучы Айчыне. Матэрыялы навук. канф. да 80-х угодкаў праф. Ф.Янкоўскага. – Брэст, 1999. – С. 132–135.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)



## РЭЗЮМЕ

**Губкіна Алена Васільеўна**

**Назвы асоб паводле дзейнасці у беларускай мове 20-х гадоў XX ст. (на матэрыяле лексікаграфічных крыніц)**

**Ключавыя словы**: семантычныя змены, звужэнне, пашырэнне значэння, лексічнае значэнне, канатацыя, стылістычныя паметы, перыферыйныя пласты лексікі, словаўтварэнне, марфалагічны спосаб словаўтварэння, суфікс, прадуктыўнасць суфікса.

**Аб'ект даследавання** – назвы асоб паводле дзейнасці, выяўленыя ў перакладных слоўніках 20-х гадоў XX стагоддзя.

**Прадмет даследавання** – больш за 1000 слоў.

**Мэта даследавання** – лексіка-семантычная, функцыянальна-стылістычная і словаўтваральная характарыстыка назваў асоб паводле дзейнасці, выяўленых са слоўнікаў 20-х гадоў.

У якасці асноўных былі выкарыстаны апісальны і параўнальна-гістарычны **метады**, а таксама прыёмы этымалагічнага, стылістычнага і словаўтваральнага аналізу.

**Навуковая навізна** даследавання ў тым, што гэта першае маштабнае вывучэнне і апісанне канкрэтнай тэматычнай групы з лексікі слоўнікаў 20-х гадоў.

**Практычная значнасць** даследавання ў тым, што яно змяшчае ў сабе вывады, якія характарызуюць асаблівасці фарміравання лексічнай і словаўтваральнай сістэм беларускай мовы ў 20-я гады, таму канкрэтны лексічны матэрыял і вынікі яго аналізу могуць быць выкарыстаны ў навуковых працах пры асвятленні пытанняў лексікалогіі і словаўтварэння, пры распрацоўцы спецкурсаў і спецсемінараў.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

## РЕЗЮМЕ

**Губкина Елена Васильевна**

**Названия лиц по деятельности в белорусском языке 20-х годов XX века (на материале лексикографических источников)**

**Ключевые слова**: семантические изменения, сужение, расширение значения, лексическое значение, коннотация, стилистические пометы, периферийные пласты лексики, словообразование, морфологический способ словообразования, суффикс, продуктивность суффикса.

**Объект исследования** – названия лиц по деятельности, выявленные в переводных словарях 20-х годов.

**Предмет анализа** – более 1000 слов.

**Цель исследования** – лексико-семантическая, функционально-стилистическая и словообразовательная характеристика названий лиц по деятельности, выявленных в словарях 20-х годов.

В качестве основных использовались описательный и сравнительно-исторический **методы**, а также приёмы этимологического, стилистического и словообразовательного анализа.

**Научная новизна** исследования в том, что это первое масштабное изучение и описание конкретной тематической группы из лексики словарей 20-х годов.

**Практическая значимость** исследования в том, что оно содержит в себе выводы, которые характеризуют особенности формирования лексической и словообразовательной систем белорусского языка в 20-е годы, поэтому конкретный лексический материал и результаты его анализа могут быть использованы в научной работе при освещении вопросов лексикологии и словообразования, при разработке спецкурсов и спецсеминаров.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

## SUMMARY

**Hubkina Alena Vasilyevna**

**Person' names due to their activity in the Belarusian language of the 20-s in XX-th century (based on the materials of lexicographical sources).**

**Key-words are**: semantic changes, contraction, meaning widening, lexical meaning, connotation, usage labels, out-layers of lexis, word-building, morphological word-building, suffixes, efficiency of suffixes.

**The point of the research:** persons' names due to their activity eliecited in the dictionaries of the 20-s.

**The subject of the analysis:** more than 1000 words.

**The aim of the research**: the lexico-semantic, functional-stylistic and word-building characteristic of persons' names due to their activity elicited in the dictionaries of the 20-s.

Descriptive and comparative-historical methods were used as the basic ones as well as the **methods** of etymolodical, stylistic and word-building analysis.

**The scientific novelty** of this research is in the fact that it is first large study and description of the specific thematic group of lexis based on the materials of the dictionaries of the 20-s.

**Practical signification**: the dissertation research contains conclusions that characterize the peculiarities os forming lexical and word-building systems of the Belarusian language in the 20-s. That is why this lexical material and the results of its research can be used in the scientific work when dealing with questions of lexicology and word-building, when working out special courses and seminars.